7. Reşit, R A. Türk tarih kurumu basımevi / R.A. Resit, B. Kudatgu. – Ankara, 1959.

*Лепеш А. В.* **Францыск Скарына – пачынальнік беларускай філасофскай традыцыі**

XVI стагоддзе – гэта час значных перамен на тэрыторыі Беларусі, звязаных з панаваннем эпохі Адраджэння, калі ўзнікае свецкая думка. Асноўнымі характарыстыкамі эпохі Адраджэння сталі пантэізм, антрапацэнтрызм, гуманізм, росквіт натурфіласофіі, увага да сацыяльна-філасофскіх праблем. Менавіта ў гэты перыяд, звязаны з асэнсаваннем чалавакам сябе як вышэйшай каштоўнасці, жыве і дзейнічае вядомы беларускі асветнік, гуманіст, першадрукар Ф. Скарына. Час актыўных дзеянняў Ф. Скарыны прыпадае на кіраванне вялікага князя літоўскага Жыгімота I Старога, які, у сваю чаргу, быў шчырым мецэнатам і любіў і шанаваў навукі. Перыяд кіравання Жыгімота I Старога называюць “залатым векам” у гісторыі Вялікага Княства Літоўскага, што, безумоўна, звязана з самім Адраджэннем і Ф. Скарынам, як найвыдатнейшым яго прадстаўніком. Ф. Скарына выказваў свае філасофскія погляды ў форме экзэгезы, тлумачэння біблейскіх тэкстаў, выкладзеных ім у прадмовах, казаннях, пасляслоўях да кніх Старога і Новага Запавету. Аналіз спадчыны Ф. Скарыны дае падставу меркаваць, што па сваіх філасофска-асветніцкіх поглядах наш зямляк належыў да крытычна-рацыянальнага накірунку, таму што ён у сваіх творах спрабаваў асэнсаваць існаванне чалавека ў грамадстве з пункту гледжання рацыянальнага сэнсу. Яго ступень эрудыцыі, яго узровень адукацыі дазвалялі выступаць яму з пазіцыі разумнага скептыцызму і выкарыстоўваць у сваёй творчасці толькі тыя веды, якія прайшлі рацыянальную праверку ў якасці сродка адукацыі і выхавання людзей.

Менавіта гэта метадалогія найшла адлюстраванне ў яго Бібліі. Біблія Ф. Скарыны – гэта не кананічнае выданне, а аўтарскае каментаванне тэкстаў Свяшчэннай кнігі. Таму ён у некаторай ступені вольна аднёсся да структуры Бібліі: змяніў парадак раздзелаў Бібліі, сваёй мовай пераказваў змест, даваў свае каментарыі і сваё тлумачэнне самаму тэксту Бібліі з мэтай зрабіць

яе сродкам асветніцтва і энцыклапедыяй жыцця. Ф. Скарына лічыў, што Біблія з'яўляецца цудоўным падручнікам па сямі вольным навукам: славесным (граматыка, рыторыка, логіка)і дакладным (матэматыка, геаметрыя, геаграфія, музыка). Акрамя гэтых ведаў Біблія магла стаць крыніцай ведаў і па гісторыі, філасофіі, эканоміцы. Дастаткова вольнае выданне Бібліі, асабліва для свайго часу, упэўнівае, што Ф. Скарына скептычна адносіўся да палажэння аб тым, што Біблія – гэта падарунак Бога. Як рацыяналіст, навуковец, дасягненні якога былі адзначаны ў Падуанскім універсітэце ў "зале сарака", Ф. Скарына не мог не бачыць некаторых недарэчнасцяў, несутыковак, якія існавалі ў Свяшчэнным пісанні.

Ф. Скарына прыйшоў да высновы, што Біблію пісалі людзі, прычым не па "гарачых слядах", а значыць там можа ўтрымлівацца шмат памылак. Таму не дзіўна, што выданні Скарыны царква сустрэла варожа. У прыватнасці, праваслаўны артадокс А. Курбскі назваў кнігі Ф. Скарыны "перапсаванымі", з адкрытай нянавісцю ставіўся да іх і ўніяцкі архімандрыт А. Сялява [1, с. 101-102].

Ф. Скарына адным з першых у еўрапейскай традыцыі звярнуў увагу на праблему натуральных правоў чалавека. Ён лічыў, что існуе две катэгорыі законаў – законы натуральныя, якія даюцца Богам пры нараджэнні і законы "пісаныя", стораныя людзьмі для рэгулявання грамадскіх і палітычных адносін. Прычым натуральны маральны закон валодае прыярытэтам: "прежде всех законов или прав писаных закон прироженый всем людем от господа бога дан ест" [2, с. 20]. Законы могуць быць розныя ў розных народаў, але ў аснове іх павінны ляжаць некаторыя агульныя прынцыпы, якія базуюцца на прынцыпах натуральнага закона. Гэтымі агульнымі прынцыпамі з'яўляюцца: справядлівасць, чалавекалюбства, задавальненне большасці жыхароў. Жадаючы пазнаёміць свайго чытача з гісторыяй узнікнення "пісаных" законаў, Ф. Скарына, адыходзячы ад Бібліі, узгадвае імёны першых заканадаўцаў перыяда старажытнасці. Гэта ён робіць у прадмове да кніг першых Царстваў [1, с. 109-110]. Вялікае значэнне надаваў Скарына ўдасканаленню сістэмы правасуддзя: "Судьи и справце да судят людей судом справедливым, и да не уклонятся ни на жадную страну, и да не зрять на лица, и не принимають даров, понеже даровеослепляюць очи муд-

рых людей и заменяюць слова справедливых" [3, с. 115]. Цікава, што гэта думка абгрунтоўваецца у эпіграфе да Статута Вляікага Княства Літоўскага 1588 г. [2, с.291].

Ф. Сарына закранаў і філасофска-этычнаю праблему адносін індывідуалнага і агульнага дабра. Паняцце агульнага дабра ў творах Ф. Скарыны фігуруе пад тэрмінам "посполитое доброе". Чалавека наш зямляк разглядаў як стварэнне грамадскае. Толькі ў грамадстве, на яго думку, жыццё чалавека можа быць напоўнена сапраўдным сэнсам. Пагэтаму чалавек павінен выкарыстоўваць свае здольнасці ў інтарэсах агульнага дабра. Дарэчы, сам Ф. Скарына менавіта так ставіўся да сваёй дзейнасці і бачыў у гэтым сэнс свайго жыцця. Фармулёўка разумення грамадскага абавязку кожнага ўтрымліваецца ў прадмове да кнігі "Эсфір": "Не толик обо сами народихомся на свет, но более ко службъ божией и посполитого доброго" [3, с. 109].

Ф. Скарына быў заснавальнікам нацыянальна-патрыятычнай традыцыі ў гісторыі беларускай культуры. Інтарэсы сайго народа і Айчыны для Скарыны былі вышэй за рэлігійныя і канфесійныя. Свой патрыятызм, любоў да Радзімы Ф. Скарына выклаў у наступных словах, якія сталі сапраўным" гімнам" адданасці роднай зямлі, і якія ведае сённі кожны школьнік старэйшэх класаў: "Понеже от прирождения звери, ходящие в пустыни, знаюць ямы своя; птицы, летающие по возъдухуведаюць гнезда своя; рибы, плавающие по морю и в реках, чуюць виры своя; пчелы и тымпадобнаяборонять ульев своих,тако ж и люди, игдезродился и ускормлены суть по бозе, к тому месту великую лакуимають" [3, с. 59].

У рэлігійным плане філосаф выступаў супраць прыярытэта любой канфесіі ў грамадстве, лічыў, што кожны можа самастойна выбіраць для сябе веравызнанне. Такім чынам, выказваўся за талерантнасць у любоў дзяржаве. Напэўна, гэта было выклікана неадназначнай рэлігійнай палітыкай у Вялікім Княстве Літоўскім яшчэ з часоў Ягайлы, заснаванай на суперніцтве праваслаўя і каталіцтва. Канкрэтныя гістрарычныя прыклады, думаю, упэўнілі Ф. Скарыну ў тым, што дзяржава не павінна рабіць акцэнт на прэваляванні пэўнай рэлігіі, што можа прывесці да грамадзянскай вайны на рэлігійнай глебе і ўвогуле да дэцэнтралізацыі ў дзяржаве (што адбылося ў дзяржаве Рэч Паспалітая).

На прыканцы хацелася б сказаць аб папулярызацыі Францыскам Скарынам на старонках сваіх выданняў важнейшай маральнай дабрачыннасці – любові да блізкага. Чалавекалюбства для Ф. Скарыны– найвышэйшы прынцып узаемаадносін паміж людзьмі, універсальны закон прыватнага і грамадскага жыцця. Галоўны хрысціянскі запавет – "палюбі блізкага сайго як самога сябе" – павінен выконвацца абсалютна адносна ўсяго чалавецтва незалежна ад сацыяльнага становішча, веравызнання, нацыянальнага паходжання. Вось яго словы на гэты конт: "Каждый хрестианин наиболей любовь ко всим да соблюдаеть, еже есть совершенна над все иные дарования, без нея же ничто поспешно ест" [3,с. 132]. Як бачым, гэты завапет на стагоддзі. Такім чынам, Ф. Скарына, як заснавальнік беларускай філасофскай традыцыі, на старонках сваіх прадмоў узняў цэлы комплекс філасофскіх, маральна-этычных праблем, на якія меў свой уласны светапогляд.

Яго галоўная заслуга – пастаноўка пралемы чалавека і грамадства. Асаблівасцю Ф. Скарыны як мысліцеля-наватара з'яўляецца спроба гуманістычнай інтэрпрэтацыі Бібліі, да якой ён, безумоўна, ставіўся з павагай. Але ж для яго яна была не столькі веравучыцельным, сколькі інтэлектуальным, маральна-павучальным і выхаваўчым творам.

Літаратура:

1. Алексютовіч, М.А. Скарына, яго дзейнасць і светапогляд / М.А. Алексютовіч. – Мінск, 1958.

2. Скарына і яго эпоха / В.А. Чамярыцкі, В.І. Мялешка,

З.Ю. Капыскі і нш.; Рэд. В.А. Чамярыцкі. – Мінск, 1990.

3. Скарына, Ф. Прадмовы і пасляслоўі / Ф. Скарына. – Мінск, 1969.

## *Лойко Л. Е.* **Ф. Скорина в духовной традиции Европы и Евразии**

Беларусь находится в европейском регионе и активно участвует в реализации методологии интеграции интеграций. Эта методология созвучна интересам евразийских государств, создающих транзитное пространство для взаимодействия КНР и России с экономическим пространством Европейского Союза. В числе белорусских мыслите-